## Вынікі 2024

### Агульная дзейнасць і каманда (I)

- Абнавілі сайт арганізацыі з асноўнай інфармацыяй пра Раду і нашыя праекты. Новая дынамічная канцэпцыя старонкі дазваляе размяшчаць асноўныя навіны, публікаваць аналітычныя агляды, даследаванні, дыскусіі, ключавыя дакументы і справаздачы. Актыўныя сацсеткі па-ранейшаму дапамагаюць распаўсюджваць асноўныя наратывы і распавядаць пра самае важнае.
- Прайшлі першы этап аўдыту лічбавай бяспекі. Мы клапоцімся пра захаванне дадзеных у адпаведнасці са стандартамі, таму дбаем пра абарону любой камунікацыі. Вынікам гэтага працэсу станецца Пратакол бяспекі, які будзе дапрацаваны з улікам заўваг і рэкамендацый адмыслоўцаў.

## Агульная дзейнасць і каманда (II)

- Працуем над новай Стратэгіяй, Статутам, і іншымі дакументамі, якія будуць рэгуляваць дзейнасць арганізацыі. Гэта неабходны крок для забеспячэння празрыстасці і інклюзіўнасці працэсу прыняцця рашэнняў: унармаваныя дакументы, распрацаваныя і прынятыя сябрамі арганізцыі, зафіксуюць унутраныя працэдуры, датычныя фінансавай дзейнасці, камунікацыі і бяспекі.
- Усяго за 2024 год на падтрымку сферы прыцягнулі: 452 034 еўра (без уліку сродкаў праграм ArtPower Belarus і "Васьміног").

## Мы і пра нас (медыя і камунікацыя)

- Правялі інфасесію, прысвечаную працы БРК у 2023.
- Вылучылі асобныя профілі ў сацсетках: для Рэсурснага Цэнтра (мэтавая аўдыторыя – актары культуры) і для Рады. Апошнія інфармуюць пра дзейнасць арганізацыі, уздымаюць пытанні, датычныя культурнай палітыкі, дыпламатыі, дзеляцца вынікамі даследаванняў культурніцкага поля.
- Выпусцілі сумесны медыяпраект з КУКУ. Выйшла 9 ролікаў, якія сродкамі сучаснай анімацыі тлумачаць базавая прынцыпы – "цвікі" – культурніцкай палітыкі. Ахоп кожнага з пастоў ад 3-4к да 16к. Таксама стварылі на сайце старонку праекта.
- Агулам налічылі больш за 120 згадак Рады ў медыях. У асноўным публікацыі тычыліся каментавання стану культуры або гучных падзей, дзейнасці арганізацыі і нашых праектаў. Таксама медыі актыўна выкарыстоўваюць дадзеныя з даследаванняў і аналітычных матэрыялаў.

## Аналітыка і даследаванні (I)

- Падрыхтавалі артыкул для Stockholm Centre for Eastern European Studies пра перспектывы для беларускай культуры.
- Паўдзельнічалі ў фокус-групе Цэнтра падтрымкі мясцовых супольнасцяў Wind Rose, прысвечанай ідэнтычнасці.
- Спрычыніліся да стварэння адвакатыўнага дакумента “Беларуская культура ў палоне рэпрэсій і барацьба за вольны голас”.
- Апублікавалі вялікі аглядны матэрыял па тэме дэкаланізацыі (Беларускі выпадак).
- Выпусцілі 2 квартальныя аналітычныя агляды. 1 і 2. Сёлета да агляданых сфер дадалася традыцыйная культура.

## Аналітыка і даследаванні (II)

- Правялі 2 круглыя сталы:
  I. Улетку: абмеркавалі стан і перспектывы беларускай арт-крытыкі.
  II. Узімку: падвялі вынікі 2024 году ў культуры.
- Распачалі сумесны праект з “Салідарнасцю” - “Культурны працэс”. Гэта серыя інтэрв’ю з экспертамі пра стан беларускай культуры.
- Распачалі даследаванне зрухаў у сімволіцы нацыянальнай ідэнтычнасці — захады, што беларускія ўлады робяць, каб сцерці значнасць нацыянальных сімвалаў і замяніць іх “сваімі”.
- Арганізавалі baseline-даследаванне стану культурніцкага поля, апублікавалі вынікі на сайце і правялі прэзентацыю для медыяў і супольнасці.

## Кірунак дапамогі (I):

У 2024 годзе атрымалі **253** звароты ад дзеячаў культуры. Яны тычыліся розных аспектаў падтрымкі, у тым ліку:

- фінансавая дапамога;
- візавая падтрымка – дапамога ў атрыманні візаў;
- кансультацыі па атрыманні псіхалагічнай дапамогі;
- кансультацыі па рэлакцыі і легалізацыі.

На працягу года правялі **212** кансультацый, скіраваных на вырашэнне індывідуальных праблем дзеячаў культуры.

У 2024 годзе падрыхтавалі **22** рэкамендацыйныя лісты, якія садзейнічалі:

- атрыманню падтрымкі для творчых праектаў ад міжнародных арганізацый;
- забеспячэнню афіцыйных працэдур у краінах знаходжання і пацвярджэнню статусу для атрымання міжнароднай абароны (уключна з пытаннямі легалізацыі);
- пацвярджэнню статусу дзеяча культуры або актывіста.

## Кірунак дапамогі (II):

**Арганізавалі:**

- 3 публічныя зборы;
- 1 непублічны збор.

**У выніку:**

- Тыдзень салідарнасці з Нінай Маргаевай: сабрана €4,341.45;
- Калядны збор для трох сем’яў у цяжкім матэрыяльным становішчы: сабрана €1,359 (€453 для кожнай сям’і);
- Збор для рэпрэсаваных дзеячаў культуры (працягваецца).

Агульная сума выплат: €23,982 (улічаны выплаты ў межах 2 траншу па Марафоне салідарнасці 2023 году);

Колькасць атрымальнікаў: 42.

## Культдыпламатыя

- Спрычыніліся да напісання некаторых адвакатыўных папер:
  I. Агульнага ліста ад беларускіх арганізацый Сейму Літвы;
  II. Ліст ад эстонскіх арганізацый у Парламент.
- Правялі круглы стол, прысвечаны культурніцкай дыпламатыі.
- Працягваем кансультаваць ОСЦ і АПК (падрыхтоўка да міжнародных візітаў).
- Зладзілі некалькі сустрэч абмену досведам: з Літоўскай Радай культуры, British Council, даведаліся больш пра працу Дацкага інстытута культуры, наведалі пасяджэнне Літоўскага кластара EUNIC.
- Узялі ўдзел у дзвюх сустрэчах сеткі NDF: у Капенгагене і Кішынёве.

## Самыя гучныя канферэнцыі

Агулам зафіксавалі больш за 50 візітаў і дыпламатычных сустрэч рознага кшталту (без уліку працоўных гутарак з партнёрамі). Сярод іх:

- Stockholm Conference on Belarus;
- Канферэнцыя IMPACT;
- BIIM;
- Tallinn YouTube Summit for Democracy and Peace;
- Truth in Motion;
- Трэцяя канферэнцыя беларусаў свету ў Празе;
- Сустрэча з кангрэсменкамі ЗША, прысвечаная тэме нацыянальнай ідэнтычнасці (па запрашэнні USAID).
- Канферэнцыі “Новая Беларусь”.
- Канферэнцыі АВВА.
- Стратэгічны дыялог з ЗША.

## Люблін – Еўрапейская Сталіца Культуры

- У сакавіку зладзілі першую сустрэчу — абмеркавалі праекты для праграмы “Люблін – Еўрапейская Сталіца Культуры-2029”.
- Падрыхтавалі першасную заяўку, дзе апісалі магчымыя маштабныя падзеі з удзелам беларусаў на пляцоўках Любліна.
- Лічым атрыманне Люблінам статусу ЕСК-2029 у тым ліку нашай перамогай. Будзем так ці інакш удзельнічаць у актыўнасцях 2027-2032.

## Ноч паэтаў

- Зафіксавалі не менш за 46 падзей у 15 краінах, 30 гарадах. Яны адбыліся з мінімальнай каардынацыяй з нашага боку. Як метадычная база выдатна спрацаваў сайт акцыі, які распрацавалі ў 2022 годзе і дапаўняем штогод напярэдадні падзеі. Тэма шырока гучала ў медыях, як беларускіх, так і замежных.

## Дні беларускай культуры

- Скончылі сваю гісторыю з Днямі культуры. Магчыма, гэта толькі перапынак

## Сойм/Форум/Кааліцыя (сумесна з іншымі арганізацыямі сферы)

- Правялі Ацэнку патрэбаў сектара (апыталі амаль 100 арганізацый і актараў) і 16 красавіка прэзентавалі Дарожную мапу ў Бруселі.
- Правялі онлайн круглы стол для ўдзельнікаў апытання і партнёраў пра механізмы фінансавання ў Еўразвязе і сутнасць дарожных мапаў. Распавялі пра прэзентацыю і працэс размеркавання вылучаных сродкаў.
- Арганізавалі падрыхтоўку да BIIM на высокім узроўні, усіх удзельнікаў натхніла, што можна працаваць разам.
- Бярэм удзел у працы па падрыхтоўцы Ацэнкі патрэбаў сектара.

## Рэсурсны цэнтр, субгрантынг

### ArtPower Belarus (рэалізуем разам з Дацкім культурніцкім інстытутам)

- Прайшлі маніторынг праекта (ROM) у канцы сакавіка.
- Вынікі ArtPower Belarus 2023-2024.

| | Applications | Supported | % of supported |
|---|---|---|---|
| **Midi** | 299 | 35 | 11.7 |
| **Mini** | 288 | 48 | 16,7 |
| **Mob** | 120 | 57 | 47,5 |
| **Total amount** | 707 | 140 | 19,8 |


20
15
10
5
0
Architecture
Art residence
Choreography
Cinema
Cross-sectoral
Education
Events
Exhibition
Fine art
Folklore
Heritage Preservation
institutional support
Literature
Media
Music
Photography
Theatre

# #ArtPowerBelarus: Колькасць падтрыманых праектаў і  мабільнасцяў (2023-2024) / прыклады рэалізаваных праектаў (2024)

**Тэатр**

**13**









**Музыка**

**18**







**Кіно**

**14**




КЛУБ БЕЛАРУСКАГА КІНО
КІНАКОЛА




**Арт**

**16**




**Літаратура**

**20**




ČYTALNIA




**Фальклор і захаванне спадчыны**

**11**







БЕЛАРУСКАЯ РАДА КУЛЬТУРЫ

**Агулам праз розныя механізмы субгрантынгу ў 2024 годзе падтрыманыя:**

- 47 праектаў у межах праграмы ArtPower Belarus.
- 34 мабільнасці, у якіх прынялі ўдзел 92 чалавекі, у межах праграмы ArtPower Belarus.
- 16 праектаў дадаткова падтрыманыя Беларускай Радай культуры ў межах іншых праграмаў.

## Сістэмы фінансавання сферы (I):

### Клуб Мецэнатаў

- Распачалі працу па адбудове мецэнацкай супольнасці. Публічная прэзентацыя адбылася падчас канферэнцыі беларускага бізнэсу ў Амерыцы ў сакавіку 2024.

### Магістраты (I)

- Цягам 2024 года ў межах праекта “Беларускія магістраты” завершаныя:
- Люты. Магістрат “Спадчына” – 9 месяцаў, 50 удзельнікаў. Сабралі прыблізна 6000 еўра.
- Сакавік. Магістрат “ULegend” – 9 месяцаў, 30 удзельнікаў. Сабралі прыблізна 4000 еўра.
- Сакавік - снежань. Магістрат “Волат” – 9 месяцаў, 26 удзельнікаў. Сабралі прыблізна 4000 еўра.

## Сістэмы фінансавання сферы (II):

### Магістраты (II)

**Запушчаныя:**

- Верасень. Магістрат “Беларуская Школа ў Варшаве”. Завяршэнне: травень 2025. На дадзены момант 29 удзельнікаў. Сабрана 1300 еўра.
- Снежань. “Магістрат Кнігі”. Гэта доўгатэрміновы магістрат, удзельнікі якога будуць рэгулярна ўкладацца ў праекты, звязаныя з развіццём беларускага кніжнага рынку. На дадзены момант у магістраце 20 чалавек. Сабрана 380 еўра.

Даведка: Першы магістрат “Кнігаўка”, запушчаны ў 2022 годзе, сабраў 23 000 еўра.
Агулам дзякуючы праекту прыцягнута больш за 40 000 еўра, у 2024 годзе – прыблізна 8 000 еўра.

## Адукацыя і нетворкінг (I):

**Школа Арт-менеджменту:**

У межах праграмы ArtPower Belarus зладзілі навучанне і выпуск пілотнага курса Школы арт-менеджменту. Для гэтага ў 2023 г правялі даследаванне адукацыйных патрэбаў мэтавых груп і ў адпаведнасці з яго вынікамі распрацавалі навучальную праграму.

Заняткі ў школе адбываліся онлайн з лютага да верасня 2024 г.

- Прынялі 64 заяўкі, выдалі 19 сертыфікатаў.
- Правялі 22 лекцыі (з іх 3 публічныя), 12 кансультацый, зладзілі практычны блок.
- Арганізавалі фінальны круглы стол з прэзентацыямі праектаў удзельнікаў.

Ладзім яшчэ адзін адукацыйны праект (непублічны), у яго межах праходзяць лекцыі, навучальныя візіты, існуе ментарская праграма.

## Адукацыя і нетворкінг (II):

**Васьміног (некаторыя вынікі за ўвесь перыяд рэалізацыі праграмы, якая ажыццяўляецца разам з “ЕўраБеларусь” і ОСЦ)**

- 113 заявак на адукацыйныя гранты ад “Васьмінога” на першы конкурс (15 падтрымалі).
- 59 заявак на другі конкурс адукацыйных грантаў ад “Васьмінога” (15 падтрымалі).
- Усяго падтрымана 30 беларусацэнтрычных адукацыйных праектаў на агульную суму 430 000 еўра.

# Адукацыя і нетворкінг (III):

## Онлайн-курсы

- Праведзена навучанне па распрацоўцы онлайн-урокаў для настаўнікаў. Дзякуючы гэтай адукацыйнай магчымасці больш за 35 педагогаў цяпер могуць выкарыстоўваць лічбавыя платформы для арганізацыі навучальнага працэсу.
- Паспрыялі стварэнню 20 інавацыйных онлайн-курсаў на беларускай мове для школьнікаў розных узростаў (было запланавана 12).
- 52 настаўнікі зарэгістраваліся на адмыслова створанай онлайн-платформе з 4400 карыстальнікамі.

## Падзеі

- Распрацаваная і стала папаўняецца інавацыйная платформа Vasminoh.
- Створаны і развіваецца YouTube-канал: Vasminoh Project (87 адукацыйных відэа, 38 тысяч праглядаў, 1090 падпісчыкаў). Відэа таксама зручна глядзець на сайце.
- Створаны цыкл адукацыйных відэа “Пра гэта не раскажуць у школе” (выйшла 15 выпускаў).
- Праведзены конкурс малюнкаў “Васьмінога” сярод дзяцей (па яго выніках распрацавалі сцікерпак фірмовы і мерч). Удзельнікі конкурсу атрымалі кашулькі і торбы са сваімі малюнкамі.

## Адукацыя і нетворкінг (III):

### Культурны Код

Кам’юніці, што яднае культуру і IT, спрыяе стварэнню і развіццю праектаў на сумежжы культуры і digital. У  супольнасці “Культурнага Кода” (у чаце ў Тэлеграм) на сёння 490 удзельнікаў.

- Зладзілі 12 паблік-токаў. Спікерамі выступалі адмыслоўцы ў SMM, мастакі, якія працуюць ў лічбавай сферы, вэб-распрацоўшчыкі. Гаворка ішла пра адметнасці працы ў Notion, пошук людзей у каманду, працу з ШІ, сучасны арт-рынак і многае іншае.
- Арганізавалі 8 пітчынгаў – онлайн-сустрэч, на якіх стваральнікі праектаў прадстаўлялі свае ідэі ці MVP. Пераможцы пітчынгаў (іх вызначалі сябры журы і ўдзельнікі супольнасці) атрымлівалі карысныя для праекта прызы – аплочаныя гадзіны кансультацый ад адмыслоўцаў (на выбар саміх пераможцаў). Усяго падчас пітчынгаў за 2024 год прэзентаваныя 32 новыя праекты/задумкі. Каля 40% з іх – праекты з Беларусі.

## Адукацыя і нетворкінг (III):

### Культурны Код

- Цягам цэлага сезона працавала камерная майстармайнд-група. Заснавальнікі праектаў дзяліліся сваімі поспехамі і праблемамі, пад кіраўніцтвам мадэратаркі спрабавалі вырашыць балючыя моманты і дамапагалі адно аднаму. Адбыліся 3 майстармайнд-сустрэчы, з якіх 1 прайшла офлайн у Варшаве.
- Апублікавалі 57 інфармацыйных пастоў з навінамі сектара, магчымасцямі, натхняльнымі падборкамі, канспектамі сустрэч і інтэрв’ю.

### Гасцёўня

- За год у Гасцёўні зладзілі і прынялі ў госці не менш за 30 мерапрыемстваў (лекцыі, рэпетыцыі, круглыя сталы, прэзентацыі), дзе агулам было больш за 400 наведвальнікаў.